# МОДУЛЬНА-РЭЙТЫНГАВЫ ПАДЫХОД ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ "БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)"

Ф. С. ШУМЧЫК

*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі" філіял "Мінскі радыётэхнічны каледж"*

Вучэбныя праграмы дысцыплін спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі аб'ёмныя па змесце, і для іх засваення дадатковыя вучэбныя гадзіны не выдзяляюцца, наадварот, як паказвае практыка апошніх гадоў, адукацыйныя стандарты спецыяльнасцей становяцца больш практыкаарыентаванымі, у вучэбных планах павялічваюцца вучэбныя гадзіны на вучэбную і вытворчую практыку, скарачаюцца гадзіны на тэарэтычнае навучанне. І дадзеная тэндэнцыя будзе пашырацца, калі ўлічыць паступовае скарачэнне тэрміну падрыхтоўкі спецыялістаў. Нягледзячы на гэта, навучальныя ўстановы павінны выконваць патрабаванні адукацыйнага стандарта, фарміраваць усе неабходныя кампетэнцыі будучага спецыяліста, грамадзяніна, асобы, здольнай прымаць правільныя рашэнні як у вытворчай, так і ў грамадска-сацыяльнай сферах. Таму наспела неабходнасць укаранення ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі з мэтай аптымізацыі адукацыйнага працэсу модульна-рэйтынгавай сістэмы навучання.

У прафесійным кампаненце вучэбных планаў спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі вучэбная дысцыпліна "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" з'яўляецца адзінай дысцыплінай, накіраванай на засваенне і прафесійнае прымяненне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў навучэнцаў уменняў правільна ўспрымаць прафесійную інфармацыю на беларускай мове, фарміраванне камунікатыўна развітай асобы, здольнай наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы. Невялікая колькасць вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне гэтай дысцыпліны, патрабуе ад выкладчыка максімальна актывізаваць навучанне, уключыць навучэнцаў у актыўную самастойную працу, самастойны пошук ведаў. Гэтага дасягнуць магчыма дзякуючы тэхналогіі модульна-рэйтынгавай сістэмы навучання.

Вучэбную дысцыпліну "Беларуская мова (прафесійная лексіка)" у адпаведнасці з тыпавой вучэбнай праграмай можна падзяліць на 6 модулей: "Мова і грамадства", "Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання", "Спецыяльная лексіка. Тэрміналогія", "Функцыянальныя стылі маўлення", "Культура прафесійнага маўлення", "Абавязковая кантрольная работа" [1]. У залежнасці ад колькасці вучэбных гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне тэм, кожнаму модулю прысвоім максімальны рэйтынгавы бал: "Мова і грамадства", "Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання", "Спецыяльная лексіка. Тэрміналогія", "Абавязковая кантрольная работа" – адпаведна па 10 балаў, "Функцыянальныя стылі маўлення", "Культура прафесійнага маўлення" – адпаведна па 30 балаў. Мінімальная колькасць балаў, якую павінен атрымаць навучэнец за кожны модуль, ранжыравана наступным чынам: "Мова і

грамадства”, “Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання”, “Спецыяльная лексіка. Тэрміналогія”, “Абавязковая кантрольная работа” – адпаведна па 4 балы, “Функцыянальныя стылі маўлення”, “Культура прафесійнага маўлення” – адпаведна па 12 балаў. У журнал вучэбных заняткаў выстаўляюцца адзнакі, з агульнай сумы якіх і выводзіцца рэйтынгавы бал навучэнца.

Рэйтынг дысцыпліны вызначаецца па 100-бальнай шкале:

| Бал | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Рэйтынг | да 19 | 20-29 | 30-39 | 40 | 41-50 | 51-60 | 61-70 | 71-80 | 81-90 | 91-100 |

Максімальная колькасць, якую можа атрымаць навучэнец, складае 100 балаў.

Пры атрыманні мінімальнай колькасці балаў навучэнцу выстаўляецца семестровая адзнака 4 балы. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што за кожны модуль навучэнец павінен атрымаць вызначаную мінімальную колькасць балаў. У адваротным выпадку ён дадаткова самастойна засвойвае матэрыял і праходзіць кантрольнае мерапрыемства (тэставанне, кантрольны зрэз, вуснае апытванне і інш.). Пры станоўчым кантролі выстаўляецца неабходны мінімальны бал.

Для стымулявання самастойнай працы навучэнцаў прадугледжаны дадатковыя заданні. Дзякуючы іх выкананню навучэнцы больш трывала засвойваюць тэмы модуля, а таксама маюць магчымасць атрымаць дадатковыя балы. У нашай практыцы кожнае дадатковае заданне ацэньваецца максімальна 4 баламі. Колькасць дадатковых заданняў вызначаецца ад колькасці вучэбных гадзін, адведзеных на вывучэнне тэм модуля. Для модулей “Мова і грамадства”, “Лексіка беларускай мовы паводле паходжання і сферы ўжывання”, “Спецыяльная лексіка. Тэрміналогія” – адпаведна па 1 заданню, “Функцыянальныя стылі маўлення”, “Культура прафесійнага маўлення” – адпаведна па 3 заданні.

Практычная рэалізацыя тэхналогіі модульна-рэйтынгавай сістэмы навучання патрабуе ад выкладчыкаў і навучэнцаў партнёрскіх адносін, пры якіх у выніках засваення дысцыпліны будуць зацікаўлены два бакі адукацыйнага працэсу.

**Спіс літаратуры**

1. Тыпавая вучэбная праграма па вучэбным прадмеце (вучэбнай дысцыпліне) “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” прафесіянальнага кампанента тыпавых вучэбных планаў па спецыяльнасцях (накірунках спецыяльнасцей) … для рэалізацыі адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне кваліфікацыі спецыяліста, рабочага з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (зацверджана Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 08.07.2016 № 61). – Мінск, РІПА, 2016.